УДК. 94(476)

# СУПРАЦЬСТАЯННЕ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬГА КАМІТЭТУ І БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ Ў ПЫТАННІ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАГА ВОЙСКА

***А. І. Лізуноў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*lizunov_97@list. ru*

У артыкуле разглядаюцца падзеі супрацьстаяння Беларускай Сацыялістычнай Грамады і Беларускага нацыянальнага камітэту ў перыяд лютага 1917 – студзеня 1918 гг. адносна пытання канцэпцыі фармавання беларускіх узброенных фармаванняў.

***Ключавыя словы:*** Беларуская Сацыялістычная Грамада, Беларускі нацыянальны камітэт, канцэпцыя, Беларуская Вайсковая Арганізацыя.

# ПРОТИВОСТОЯНИЕ БЕЛОРУССКОГО НАЦИОНАЛЬНОГО КОМИТЕТА И БЕЛОРУССКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ ГРОМАДЫ ПО ВОПРОСУ ФОРМИРОВАНИЯ БЕЛОРУССКОЙ АРМИИ

***А. И. Лизунов***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*lizunov_97@list. ru*

В статье рассматриваются события противостояния Белорусской Социалистической Громады и Белорусского национального комитета в период февраля 1917 – января 1918 гг. относительно вопроса концепции формирования белорусских вооружённых формирований.

***Ключевые слова:*** Белорусская Социалистическая Громада; Белорусский национальный комитет; концепция; Белорусская Военная Организация.

# CONFRONTATION BETWEEN BELARUSIAN NATIONAL COMMITTEE AND BELARUSIAN SOCIALIST ASSEMBLY ON THE CREATION OF BELARUSIAN ARMY

***A. I. Lizunov***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus*
*lizunov_97@list. ru*

The article examines the events of the confrontation between Belarusian Socialist Assembly and Belarusian National Committee in the period February 1917 – January 1918, regarding the issue of the concept of creating Belarusian military formation.

***Key words:*** Belarusian Socialist Assembly; Belarusian National Committee; conception; Belarusian Military Organization

Падзеі Першай сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. падзялілі далейшы ход гістарычных падзей, пакінуўшы

ў мінулым «новы час» і даўшы пачатак «навейшаму часу». 1917–1918 гг. сталі для беларускага грамадства тым перыядам, калі яно зведала ўвесь спектр разнастайнасці канфліктаў – гвалтоўных і мірных, унутрыгрупавых, міжгрупавых, міжнародных, эканамічных, культурных і палітычных. Сярод іх варта вылучыць і канфлікт унутры беларускага нацыянальнага руху – паміж Беларускім нацыянальным камітэтам (БНК) і Беларускай сацыялістычнай грамадой (БСГ).

Беларускі нацыянальны камітэт быў аформлены 27 сакавіка 1917 г. як грамадска-палітычная арганізацыя з правым ухілам. Ён фінансаваўся буйнымі беларускімі землеўладальнікамі, сярод якіх былі Э. Вайніловіч, князь С. Радзівіл, князь Г. Друцкі-Любецкі і іншыя. Дастаткова хутка БНК пачаў разрастацца за кошт афіляцыі ў яго склад прадстаўнікоў разнастайных мясцовых арганізацый. Гэта выклікала рэарганізацыю Беларускага нацыянальнага камітэта ў палітычную сілу з усімі неабходнымі рэгаліямі. Камітэт падтрымалі разнастайныя культурна-асветніцкія і палітычныя арганізацыі розных кірункаў [1, с, 4].

Як процівага Беларускаму нацыянальнаму камітэту дзейнічала Беларуская сацыялістычная грамада, якая аб'ядноўвала ў сваіх шэрагах прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху пераважна сацыялістычнага кірунку. Але варта заўважыць, што БСГ пасля аднаўлення сваёй дзейнасці 24 сакавіка 1917 г. стала паступова распадацца на шэраг іншых партый і рухаў з процілеглымі палітычнымі поглядамі. Тым не менш, нават у такіх умовах БСГ уяўляла сабой для БНК аднаго з асноўных канкурэнтаў па шэрагу пытанняў, у тым ліку і па пытанні стварэння беларускага войска.

У супрацьстаянні па гэтым пытанні кожны з бакоў меў свае меркаванні. Беларускім нацыянальным камітэтам прадугледжвалася беларусізацыя вайсковых фарміраванняў, якія павінны былі складацца пераважна з беларусаў. Пры гэтым, варта заўважыць, што на фоне тых нацыянальных зменаў, якія адбываліся ў былой Расійскай імператарскай арміі цэнтралізавана (украінізацыя), то беларусізацыя пэўных частак праходзіла стыхійна. Беларускія вайскоўцы без дазволу зверху самі арганізоўвалі нацыянальныя арганізацыі непасрэдна ў войску. Аб гэтым сведчыць узнікненне 15 мая 1917 г. Беларускай вайсковай арганізацыі (БВА) афіляванай з БНК, Часовага Выканаўчага камітэта беларускіх-вайскоўцаў пры 12-й арміі. Сам праект беларускага войска паралельна з БВА распрацоўвала Арганізацыя беларусаў-аўтанамістаў. Ён

прадугледжваў стварэнне беларускіх частак у складзе Расійскай арміі [3, с. 38].

Беларуская сацыялістычная грамада займала супрацьлеглую пазіцыю па дадзеным пытанні – ідэя стварэння беларускага войска ў перыяд вясны–лета 1917 г. увогуле адмаўлялася. БСГ аргументавала гэта тым, што з’яўленне асобных нацыянальных вайсковых фарміраванняў унясе разлад у адносіны паміж беларускім рухам і Часовым урадам, а таксама можа справакаваць яго на рэпрэсіўныя дзеянні. Выйсце з усіх спрэчных пытанняў Беларуская сацыялістычная грамада бачыла ў шчыльнай супрацы з Часовым урадам і агульнарасійскімі партыямі [1, с. 10].

Сутыкненне паміж БНК і БСГ адбылося 8 ліпеня 1917 г. на з’ездзе беларускіх арганізацый. Пад шквалам крытыкі, якая ўключала ў сябе ігнараванне пытанняў з’езду, дэманстратыўны зыход са з’езду (Беларускі Народны Саюз), БНК быў распушчаны. Крытыку таксама зведала і БСГ. Як вынік, падчас з’езду была створана Цэнтральная рада беларускіх арганізацый і партый (ЦРБАІП), якая была павінна аб’яднаць беларускі нацыянальны рух і нівеліраваць спрэчныя пытанні. У першы склад Выканкама Цэнтральнай рады былі ўключаны два прадстаўнікі правага кірунку (А. І. Лявіцкі і А. А. Смоліч), астатнія трое – былі сябрамі БСГ. На першым з’ездзе ЦРБАІП у склад Выканкама былі ўведзены новыя прадстаўнікі левых сіл (эсэраў і БСГ), у выніку чаго кіруючы орган рады стаў сацыялістычным па сваім характары [2, с. 67]. У сувязі з гэтым дамінуючай пазіцыяй у пытанні стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў стала грамадоўская. Гэта пацвярджае той факт, што на жнівеньскім з’ездзе ЦРБАІП было вырашана, што любыя спробы стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў з’яўляюцца шкоднымі і непатрэбнымі. Тыя арганізацыі, якія ўжо існуюць і спрабуюць праводзіць дзейнасць падобнага кшталту, павінны яе спыніць і абмежавацца выключна культурна-асветніцкай дзейнасцю ў асяроддзі беларусаў-вайскоўцаў [4, с. 138].

Але гэта не спыніла стыхійнай дзейнасці беларускіх вайскоўцаў, якія арыентаваліся да гэтага на БНК. Так, 20 ліпеня 1917 г. быў створаны Часовы выканаўчы камітэт беларусаў-вайскоўцаў 12-й Арміі, а на Балтыйскім флоце – Арганізацыя беларусаў матросаў балтыйскага флоту на чале з В. Л. Мухай, да якой у хуткім часе далучыўся генерал-маёр К. А. Аляксееўскі. На Заходнім і Паўднёва-Заходніх франтах дзейнічалі шэраг беларускіх вайсковых арганізацый. Пры гэтым, некаторыя з іх дзейнічалі ў

паўлегальных умовах, бо летам 1917 г. Часовы ўрад забараніў праводзіць з'езды вайскоўцаў і стварэнне новых арганізацый [5, с. 50].

Такім чынам, намінальна ў супрацьстаянні ўнутры беларускага нацыянальнага руху па пытанні беларускіх вайсковых фарміраванняў у міжрэвалюцыйны перыяд перамога была на баку БСГ. Але гэта не магло спыніць стыхійнай працы беларускіх афіцэраў у расійскім войску па згуртаванню беларускіх вайскоўцаў, якія маглі стаць падмуркам да стварэння беларускага войска.

Варта адзначыць, што адзначаная пазіцыя ЦРБАІП не была статычнай – сваю дынаміку яна набыла восенню 1917 г. На гэта паўплывала змена ў стаўленні Часовага ўраду па пытанні нацыянальных вайсковых фарміраванняў. Так, у адпаведнасці з канцэпцыяй генерала М. М. Духоніна да канца лістапада 1917 г. Расійская армія павінна была перафарміраванай па нацыянальна-тэрытарыяльнай прыкмеце, каб у павысіць маральны стан у войску. З гэтай мэтай М. М. Духонін дазволіў правядзенне 18–21 кастрычніка 1917 г. з'езда беларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронту [5, с. 58], на якім была створана Цэнтральная беларуская вайсковая рада (ЦБВР) на чале з С. А. Рак-Міхайлоўскім, якога потым замяніў генерал-лейтэнант К. А. Кандратовіч. У «Грамаце да беларускага народу» прадстаўнікі ЦБВР заклікалі да стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў [3, с. 44].

Адначасова з гэтым ЦРБАІП таксама выдала заклік да стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў. Але, варта адзначыць, што гэта была запозненая спроба ўзначаліць стыхійны вайсковы рух, які на момант выдання закліку атрымаў сваю інстытуалізацыю. Менавіта дазвол стварэння вайсковых фармацый паказаў БСГ тое, што напэўна іх тактыка была правільнай, нягледзячы, што суседнія народы ўжо стварылі свае вайсковыя фармацыі, якія ў будучыні стануць падмуркам для вайсковых фарміраванняў новых дзяржаў (напрыклад, украінізаваныя часткі, якія пераўтварыліся ў Армію УНР, корпус Доўбар-Мусьніцкага). Тактыка чакання быццам бы прынесала афіцыйнасць беларускага войска, але ў той час, калі канцэпцыя БНК магла быць небяспечнай і шкоднай з-за негатыўнай рэакцыі ўлады [3, с. 42].

Праца па стварэнні беларускіх вайсковых фарміраванняў распачалася ў рэзервовых дружынах, якія фарміраваліся па тэрытарыяльнай прыкмеце, і канчатковай мэтай мела стварэнне Першага Беларускага пяхотнага палка. Але праца ў гэтым кірунку правалілася з-за Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пасля таго, як пасаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага заняў М. В.

Крыленка, адбыўся з’езд беларускіх вайскоўцаў у Віцебску, які выказаўся за працяг працэсу стварэння беларускага войска. М. В. Крыленка згадзіўся з гэтым, а 24 лістапада 1917 г. нават быў атрыманы афіцыйны бальшавіцкі дазвол [5, с. 59]. Апошні меў свае акалічнасці. Нацыяналізаваць частку можна было толькі праз агульную згоду ўсіх вайскоўцаў часткі. У выніку, гэта сарвала беларусізацыю рэзервовых дружын, а неўзабаве пад ціскам партыі М. В. Крыленка скасаваў пагадненне з беларускімі вайскоўцамі. Як вынік, Першы Беларускі полк быў падначалены 289 палку і перакінуты на змаганне з Белым рухам на ўсход [3, с. 48]. Нягледзячы на забарону, стварэнне беларускіх вайсковых фарміраванняў не спынялася. У гэты час паўсталі Беларускі уланскі полк у Пскове, Адэскі батальён, Першы Смаленскі полк, Беларускі эскадрон пад кіраўніцтвам Р. Якубені. Аднак ужо да лютага 1918 г. ўсе беларускія вайсковыя фарміраванні, якія існавалі на падкантрольнай саветам тэрыторыі, былі ліквідаваны [5, с. 65–67].

Такім чынам, неабходна адзначыць, што ў супрацьстаянні паміж Беларускім нацыянальным камітэтам і Беларускай сацыялістычнай грамадой у пытанні стварэння беларускага войска перамаглі прадстаўнікі БСГ. Гэта адбылося па некалькіх прычынах. Кіруючая роля ў БНК была ў руках прадстаўнікоў правага кірунку беларускага нацыянальнага руху, а таксама прадстаўнікоў каталіцкага касцёлу і фінансавалася буйнымі землеўладальнікамі і магнацкімі коламі, што адштурхоўвала ад іх шмат прадстаўнікоў левага кірунку. Пераважная большасць прадстаўнікоў левых ідэй, нават пасля шэрагу расколаў у БСГ, працягвалі падтрымліваць іх канцэпцыю. Ці ўвогуле, выношвалі ідэю стварэння беларускай Чырвонай гвардыі як часткі агульнарасійскай Чырвонай гвардыі. Як прыклад прыхільнікі дадзенай канцэпцыі прыводзілі дзейнасць так званага Чырвонага казацтва ва Украіне. Падтрымка ідэй БНК у вайсковым асяроддзі была абмежавана з боку Часовага ўраду, пэўная частка якога не падтрымлівала саму ідэю беларусізацыі вайсковых частак, а таксама з-за супрацьдзеяння іншых нацыянальных фарміраванняў. Вядомы выпадкі актыўнай агітацыйнай дзейнасці з боку палякаў, якія перацягвалі беларусаў-вайскоўцаў у свае фарміраванні. Такім чынам, момант стварэння беларускіх вайсковых падраздзяленняў быў страчаны.

Менавіта на момант, калі БСГ была гатова ўзначаліць беларускі вайсковы рух, які праходзіў ужо стыхійна, гэтыя працэсы былі перакрэслены Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Такім чынам, канцэпцыя БСГ, згодніцтва з Часовым урадам, таксама правалілася. У выніку

супрацьстаяння канцэпцыі як БСГ, так і БНК праваліліся. Нават тыя падраздзяленні, якія былі створаны, ліквідавала новая савецкая ўлада.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Ф. 500. Воп. 1. Спр. 398.
2. Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.). Мінск: БДУ, 1999. 128 с.
3. Латышонак А. Жаўнеры БНР. Беласток: Беларускае Гістарычнае Таварыства; Вільня, Інстытут беларусістыкі, 2009. 366 с.
4. Рудовіч С. С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мінск: Тэхналогія, 2001. 200 с.
5. Łatyszonek O. Białoruskie formacje wojskowe 1917–1923. Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 1995. 273 c.